## 22 — 23 ЧЭРВЕНЯ Ў МІНСКУ — V УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

**Барыс СВЯТЛОЎ,**
міністр культуры
Рэспублікі Беларусь



Міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў, адказваючы на пытанні прэсы, акрэсліў найбольш актуальныя кірункі сферы культуры, якія будуць вынесены на V Усебеларускі народны сход, перадае БелТА.

Па словах Барыса Святлова, важна ствараць такія ўмовы, каб сфера культуры больш актыўна зарабляла самастойна, тым самым можна палегчыць нагрузку, якая ляжыць на дзяржаве па фінансаванні сферы. "Усю культуру аддаць на самаакупнасць немагчыма, — адзначыў міністр. — Высокую, акадэмічную культуру трэба падтрымліваць. У той частцы, якая тычыцца менавіта нейкіх узораў культуры, павінна быць поўная падтрымка дзяржавы, у астатнім — максімальна зрабіць так, каб нашы ўстановы культуры сталі зарабляць грошы ".

На V Усебеларускім народным сходзе, па словах міністра, будуць закрануты такія напрамкі, як прафесійнае мастацтва, народная творчасць і падрыхтоўка кадраў у сферы культуры. Плануецца падвесці вынікі мінулай пяцігодкі. У прыватнасці, плануецца разгледзець вынікі рэалізацыі дзяржпраграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вытворчасці слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі "Слуцкія паясы" на 2012 — 2015 гады.

**Ірына ДАРАФЕЕВА,**
заслужаная артыстка
Рэспублікі Беларусь,
загадчык кафедры
мастацтва эстрады
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры і мастацтваў



— На Пяты Усебеларускі сход збіраюся з самым пазітыўным настроем. Прыемна, што мне выпаў такі гонар — і адначасова адказнасць, бо ва ўсіх нас ёсць свае надзеі на гэты самы, бадай, галоўны форум у жыцці краіны. Спадзяюся, што частка пытанняў, закранутых на ім у цяперашні Год культуры, будзе тычыцца сферы мастацтва. Хацелася б, калі надасца такая магчымасць, агучыць і свае думкі на гэты конт.

Колішняе дзяржаўнае рашэнне аб 75-ці адсотках беларускай музыкі ў эфіры дало творчы ўсплёск, на гэтай хвалі з'явілася нямала папулярных сёння, а тады зусім новых аўтараў і калектываў. З цягам часу суадносіны "наша — замежнае" змяніліся, і моладзь зноў, нават маючы перамогі ў конкурсах і тэлешоу, багаты рэпертуар і запісаныя кампакт-дыскі, не можа прабіцца на вялікую сцэну, якой стаўся тэлеэкран. Другая праблема непасрэдна звязана з БДУКіМ, дзе я ўзначальваю кафедру мастацтва эстрады. У нашай навучальнай установы, як ні дзіўна, няма ўласнай тэатральна-канцэртнай залы. Так, мы ладзім выступленні на сцэне Маладзёжнага тэатра эстрады, у Музычным тэатры паставілі мюзікл "Дуброўскі", які стаў рэпертуарным, зараз рыхтуем новую прэм'еру — "Казанова" ўсё таго ж Кіма Брэйтбурга. Але ўсё гэта — у арандаваных залах. Ці ж не парадокс?..



**Ганна КОНАНАВА,**
старшы выкладчык кафедры
малюнка, жывапісу, скульптуры
Беларускай дзяржаўнай акадэміі
мастацтваў, кандыдат
мастацтвазнаўства

— Міжнародны прэстыж нацыі стварае творчая эліта. На сёння работа дзяржавы па выхаванні і падтрымцы творчай інтэлігенцыі знаходзіцца на годнай вышыні. І ўтрымліваецца гэтая планка праз штодзённы маніторынг варункаў крэатыўнай дзейнасці. Па-за увагай не застаюцца і прыватныя моманты забеспячэння творчых працэсаў. Бо калі ўкладзены сур'ёзныя сродкі ў прафесійную адукацыю маладога спецыяліста, але пры гэтым адсутнічаюць умовы для рэалізацыі атрыманых ведаў і навыкаў — грошы, лічы, змарнаваныя. Архітэктару, мастаку неабходная майстэрня; акцёру, музыканту, танцору — сцэна, кінааператару — тэхнічны рыштунак і гэтак далей. І калі з адукацыяй усё добра, але ў паслядыпломным жыцці ўзнікаюць праблемы, напрацаваны ў час навучання творчы патэнцыял можа застацца незадзейнічаным у культурным працэсе. Праз гэта выяўляецца небяспека ўзнікнення фінансавых дзірак і міграцыі спецыялістаў культуры.

Пытанне, на якое варта звярнуць увагу, — гэта захаванне ўжо існуючай матэрыяльнай базы сістэмы мастацкай, музычнай, тэатральнай адукацыі і давядзенне яе да сусветных стандартаў. Важна здзейсніць удумлівае, ашчаднае ўкараненне Балонскага працэсу ў сістэму нашай адукацыі, узяць толькі лепшае. Бо, як кажуць, "прышчэпка" мусіць умацаваць крою, але не змяніць генетычны код.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ